У дзень успаміну св. Цэцылі, апякункі сакральнай музыкі

Аўтар: Рэдакцыя
01.11.2009 21:13



Пад канец лістапада, калі мы ўспамінаем пра св. Цэцылію, апякунку сакральнай музыкі і касцёльных музыкантаў, то думаем пра тых, хто сваёй ахвярнай працай даносіць вернікам прыгажосць літургічнай музыкі. Мы ўспамінаем таксама і пра харавыя калектывы, якія ажыўляюць жыццё ў нашых парафіях. Да нашага часу дайшла трапная думка св. Аўгустына: “Хто спявае, той два разы моліцца”. Таму ў сённяшнім нумары газеты “Слова Жыцця” мы хочам крыху расказаць нашым чытачам пра некаторыя дыяцэзіяльныя хоры і калектывы, якія дзякуючы музыцы і спевам уводзяць вернікаў у таямніцы веры. †



Звыш 15 гадоў удзельнікі ансамбля “Ave” ВДС з Гродна даносяць Евангелле да людскіх сэрцаў сваімі песнямі. Няспынна музычны гурт суправаджае маладзёжныя краёвыя і замежныя сустрэчы, выступае з канцэртамі падчас пілігрымкаў і парафіяльных урачыстасцяў. У 1995 г. у Беластоку была запісана першая касета пад назвай “Адкрый,Пане, сэрца маё”. З цягам часу свет убачыў чарговыя дыскі: “Твая Любоў” (2004 г.), “Каб мог ісці за Табой” (2006 г.), “Ufam Ci” (2007 г.), “Poranek” (2008 г.). Напэўна, найлепш клерыкі даносяць да людскіх сэрцаў радаснае сведчанне аб сваёй веры з дапамогай музыкі і спеваў.

У дзень успаміну св. Цэцылі, апякункі сакральнай музыкі

Аўтар: Рэдакцыя
01.11.2009 21:13



